ЗВЯЗДА

# Геаграфія дзелавога супрацоўніцтва: Еўрапейскі саюз

## Чэшская Рэспубліка

Міхал ГЕЛБІЧ:

# «ЦІКАВАСЦЬ ДА КААПЕРАЦЫІ І ІНВЕСТЫЦЫЙ У БЕЛАРУСІ РАСЦЕ!»

**У 2008 годзе ўзаемны тавараразварот Чэхіі і Беларусі склаў каля 450 мільёнаў долараў. У 2009 годзе ён знізіўся ва ўмовах сусветнага фінансавага крызісу. Ці магчыма змяніць гэту тэндэнцыю сёлета? На гэтае і іншыя пытанні адказвае дарадца па эканамічных пытаннях Пасольства Чэшскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Міхал ГЕЛБІЧ.**



— 2008 год быў сапраўды паспяховым, — адзначыў спадар Гелбіч. — За ўвесь перыяд двухбаковых адносінаў наш гандлёвы баланс дасягнуў рэкордных адзнак. Аднак ужо ў чацвёртым квартале можна было назіраць запаволенне і нават паніжэнне, якое ў 2009 годзе дасягнула ў доларавым эквіваленце амаль 40 працэнтаў. Гэта трохі парадаксальна, калі ўлічваць, што летась у Чэхіі і Беларусі двухбаковых мерапрыемстваў праходзіла больш за ўсё. Але мы гэта разглядаем як унёсак у будучыню супрацоўніцтва. У астатнім, што датычыцца агульнага выніку знешняга гандлю Чэшскай Рэспублікі, то ён у 2009 годзе скончыўся са станоўчым сальда 8,5 мільярда долараў, што на 56 працэнтаў больш, чым у 2008 годзе.

**— Якія тэрытарыяльна-адміністрацыйныя адзінкі Чэхіі ў большай ступені зацікаўлены ў пабудове канструктыўных дзелавых адносінаў з беларускімі рэгіёнамі?**

— Супрацоўніцтва на рэгіянальным узроўні, зразумела, з'яўляецца наступным лагічным крокам для больш інтэнсіўных узаемаадносінаў. Наведванне Віцебскай вобласці было першай ластаўкай. Што датычыцца наладжвання сувязяў на ўзроўні рэгіёнаў, то цяпер мы выбіраем беларускага рэгіянальнага партнёра для Аламоуцкага края.

**— У Беларусі існуе каля 50 сумесных прадпрыемстваў з чэшскім капіталам. Якія новыя прапановы ў гэтай галіне могуць паступіць з боку чэшскіх партнёраў у хуткім часе?**

— Я перакананы, што Беларусь для чэшскіх прадпрыемстваў — вельмі прывабны рэгіён, асабліва ўлічваючы тое, што меркаваная праца Мытнага саюза з Расійскай Федэрацыяй і Казахстанам адкрывае інвестарам сташасцідзесяцімільённы рынак. Але гэта не адзіная прычына. Сваю ролю адыгрывае геаграфічная блізкасць Беларусі, кваліфікаваная працоўная сіла і, калі параўноўваць з іншымі краінамі СНД, адносна добра развітая інфраструктура. Значным фактарам з'яўляецца вельмі падобная структура прамысловасці нашых краін. Гэтак жа, як і ў Чэхіі, у Беларусі вырабляюцца транспартныя сродкі, апрацоўчыя станкі, прамысловая прадукцыя. Беларускія заводы імкнуцца з гэтай прадукцыяй пранікнуць на рынак Еўрасаюза, а чэшскія — у краіны СНД. Мы можам альбо канкурыраваць адзін з адным, альбо супрацоўнічаць. Я перакананы, што з чэшскага боку можна чакаць цікавасці да кааперацыі і інвестыцый у Беларусі.

**— У 2008 годзе ў беларускую эканоміку з Чэхіі паступіла каля 30 мільёнаў долараў інвестыцый. Існуе цікавасць чэшскіх партнёраў да развіцця беларускіх транспартна-лагістычных цэнтраў. Якія новыя перспектыўныя праекты па гэтым і іншым напрамках абмяркоўваюцца цяпер?**

— Я не хацеў бы апярэджваць намеры чэшскіх фірмаў, скажу толькі, што падрыхтоўваюцца праекты ў галіне павярхневай апрацоўкі, узнаўлення і завастрэння прыладаў, вытворчасці абсталявання для энергетыкі, кааперацыйнай вытворчасці апрацоўчых станкоў, субпадраднай вытворчасці для беларускіх хімічных заводаў і г.д. Гэта праекты прамых інвестыцый. Ёсць таксама шэраг іншых праектаў, у якіх мы мяркуем крэдытны ўдзел чэшскім банкаў і, перш за ўсё, Чэшская экспартнага банка і дзяржаўнай экспартнай страхавой кампаніі EGAP. Гаворка ідзе аб праектах мадэрнізацыі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў. Мы імкнёмся мяняць стратэгію. Гэта значыць, што акрамя фінансавання праектаў мы таксама разлічваем на ўдзел у гэтых праектах беларускіх вытворчых прадпрыемстваў. Акрамя таго, мы хочам пастаўляць не толькі абсталяванне, але і комплексныя тэхналагічныя рашэнні. І тут шмат будзе залежаць ад беларускага боку. Пакуль у нас такое адчуванне, што сучасная мадэрнізацыя ў беларускім разуменні азначае адзінкавую замену старога абсталявання на новае. Мы разглядаем мадэрнізацыю як пабудову цэлага тэхналагічнага сектара вытворчасці, які будзе адпавядаць самым апошнім трэндам.

**— Якія крокі па развіцці дзелавога партнёрства малых і сярэдніх прадпрыемстваў дзвюх краін можа прапанаваць чэшскі бок?**

— Малыя і сярэднія прадпрымальнікі адыгрываюць важную ролю пры стварэнні новых працоўных магчымасцяў і наогул з'яўляюцца фактарам сацыяльнай стабільнасці і эканамічнага развіцця краіны. У Чэхіі іх доля ў ВУП і экспарце складае каля 35 працэнтаў, у прадукцыйнасці і выкананай дабаўленай вартасці — больш за 50 працэнтаў. Для іх наступнага развіцця неабходна паляпшэнне ўмоў для прадпрымальніцтва (спрашчэнне падатковага заканадаўства і паніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі), прамая падтрымка пры дапамозе розных праграм, як са структурных фондаў ЕС (уступленне ў прадпрымальніцтва, падтрымка ўступлення на замежныя рынкі, падтрымка развіцця чалавечых рэсурсаў, уключаючы сферу міжнароднага гандлю, энергазахавання і г.д.), так і на нацыянальным узроўні (сертыфікацыя, прамысловы дызайн). Аднак гаворка ідзе не толькі пра малое або сярэдняе прадпрымальніцтва. Мы бачым і іншыя галіны, у якіх можам перадаць Беларусі нашу практыку. Напрыклад, калі казаць аб прамых замежных інвестыцыях, мы прапануем беларускім установам супрацоўніцтва з нашым агенцтвам па падтрымцы інвестыцый CzechInvest, дзякуючы якому ЧР некалькі гадоў запар прыцягвала самыя вялікія інвестыцыі ў Еўропе на душу насельніцтва. Пры дапамозе гэтай арганізацыі можна падрыхтаваць і іншае практычнае навучанне, напрыклад, весці гандлёвыя перамовы з буйнымі замежнымі вытворцамі аб кааперацыі і субпадрадных заказах.

**— У лістападзе 2009 года ў Мінску прайшло першае пасяджэнне Працоўнай групы па супрацоўніцтве ў галіне энергетыкі, у якім узялі ўдзел прадстаўнікі шасці чэшскіх кампаній. Якія перспектыўныя прапановы абмяркоўваліся падчас мерапрыемстваў? Які патэнцыял бачыцца вам ва ўзаемадзеянні ў гэтай галіне?**

— Энергетыка — гэта тая вобласць, на якой мы хочам засяродзіцца. ЧР з'яўляецца традыцыйным вытворцам абсталявання для энергетыкі, як для ядзернай, так і для класічнай або альтэрнатыўнай, таму ў гэтым кірунку нам ёсць што прапанаваць. Па-другое, мы з'яўляемся краінай, якая вельмі клапоціцца пра сваю энергетычную бяспеку, дыверсіфікуе пастаўкі энергетычнай сыравіны, будуе дастатковыя рэзервныя запасы ў выпадку збояў, павялічвае долю вытворчасці электрычнасці з аднаўляльных крыніц, рэалізуе праграмы энергазахавання. Такім чынам, у гэтым кірунку мы таксама можам падзяліцца досведам з беларускім бокам. Падчас пасяджэння разглядаліся, напрыклад, праекты ў галіне перапрацоўкі біямасы (торфу) і яе выкарыстання для выпрацоўкі цяпла і электраэнергіі, камплектацыі чэшскімі CNG рухавікамі беларускіх аўтобусаў МАЗ, сумесная вытворчасці розных энергетычных кампанентаў, павышэння эфектыўнасці газасховішчаў і г.д. У будучыні мы хацелі б пастаўляць важныя інвестыцыйныя комплексы, такія як, напрыклад, будаўніцтва цеплаэлектрастанцыі пад ключ.

**— Рэалізацыя якіх праектаў плануецца ў навукова-тэхнічнай галіне ў хуткім часе?**

— У снежні мінулага года ў Празе была падпісана дамова аб стварэнні Чэшска-Беларускага інавацыйнага цэнтра. Магу сказаць, што адным з інвестыцыйных праектаў, які мы, як пасольства, будзем падтрымліваць, з'яўляецца супрацоўніцтва ў галіне нанатэхналогій.

**— Якія інавацыйныя падыходы прапаноўваюцца Чэхіяй для таго, каб атрымаць станоўчыя вынікі ад узаемадзеяння з Беларуссю ў рамках праграмы «Усходняе партнёрства»?**

— Чэхія яшчэ ў 2008 годзе нароўні з Польшчай і Швецыяй з'яўлялася самым актыўным ініцыятарам стварэння «Усходняга партнёрства». Канцэпцыі кагерэнтнай палітыкі ЕС ва ўсходнім напрамку доўга не хапала, і менавіта заснаванне «Усходняга партнёрства» сумесна з «Пражскай дэкларацыяй» падчас чэшскага старшынства ў ЕС — гістарычны і стратэгічны крок па напрамку да найбольшага ўзаемадзеяння ЕС з усходнімі суседзямі. Чэшская Рэспубліка імкнецца да далейшага прыцягнення цікавасці да ўсходняй суседскай палітыкі пры дапамозе папаўнення крыніц фінансавання гэтай праграмы з бюджэту Еўрасаюза. Мы разумеем часам перабольшаныя чаканні ўсходніх партнёраў, але яны павінны ўсведамляць, што гэта вельмі малая ініцыятыва, якая павінна дастаткова выспець. Што датычыцца двухбаковага супрацоўніцтва ў рамках гэтай праграмы, то працэс знаходзіцца на стадыі распрацоўкі і зандавання, прычым мы маем на ўвазе праекты ў перыяд 2014—2020 гадоў.

**Пытанні задавалі Кацярына ДАРАФЕЙЧЫК і Барыс ЗАЛЕСКІ.**

## Германія


### Прамысловасць. Энергетыка. Паліва

MHG Maschinenfabrik Hombak GmbH, образованная в 1967 году как производитель специзмельчительного оборудования, в настоящее время имеет большой выбор в поставках машин и установок для механико-технологических процессов во всех отраслевых сферах, центром которых являются:

MHG

- химическая и пищевая промышленность,
- производство кормов,
- деревообработка,
- переработка минералов, синтетики и пластмасс,
- переработка всех видов отходов.

В программу выпускаемого оборудования входят измельчительные установки, сортировочные аппараты, системы отделения и смешивания, устройства для мытья и сушки и т.д.

Мы выполняем заказы по изготовлению специфических устройств для клиентов, планируем и конструируем линии под ключ, оказываем поддержку при оптимизации и перерасчете существующих линий, проводим лабораторные и экспериментальные опыты.

Наша работа может охватывать монтаж и внутренние работы, так же как и обучение и повышение квалификации руководящего и обслуживающего персонала. Поставка запасных и быстроизнашивающихся частей также является важной частью нашей совместной работы с клиентом.

Наш адрес:
MHG Maschinenfabrik Hombak GmbH
Wolfslochstraße 51
66482 Zweibrücken / Germany

Тел.: +49-6332-913850
Факс: +49-6332-913870
e-Mail: mhg@mhg-hombak.com
Internet: www.mhg-hombak.com